УДК 338.439.053(476)«1916–1917»

**М. Я. Сяменчык**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ВЫРАШЭННЕ ХАРЧОВАЙ ПРАБЛЕМЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1916 – ПАЧАТКУ 1917 Г.

У артыкуле паказана становішча з забеспячэннем харчовымі прадуктамі салдат Дзеючай арміі і насельніцтва прыфрантавой Беларусі напярэдадні і ў пачатку Лютаўскай рэвалюцыі. Адзначана месца сельскагаспадарчых прадуктаў краю ў сістэме харчовага забеспячэння фронту і тылу да рэвалюцыі і пасля яе. Акрэслены сутнасць харчовай праблемы, спосабы і вынікі яе вырашэння. Сканцэнтравана ўвага на харчовай палітыцы дзяржаўных органаў і стаўленні да яе беларускага сялянства. Вызначаны тэндэнцыі ў справе забеспячэння сельскагаспадарчымі прадуктамі салдат Заходняга фронту да збору ўраджаю 1917 г.

**Ключавыя словы**: Беларусь, Заходні фронт, сельская гаспадарка, рэквізіцыя, харчовая праблема, харчовы камітэт, хлебная манаполія, цвёрды кошт.

**M. Ya. Siamenchyk**
Belarusian State Technological University

# ADDRESSING THE FOOD PROBLEM IN BELARUS IN LATE 1916 – EARLY 1917

The article dwells upon providing the combat armed forces and the population of Belarus' front-line areas with food products on the eve and at the beginning of the February revolution. The author describes the role of domestic agricultural products in the food security system of the front and the rear before and after the revolution. The essence of the food problem, the methods for its solving as well as the results of it are shown. The article focuses on the government's food policy and the Belarusian peasantry's attitude to it. Trends in supplying agricultural products to the Western Front soldiers before the 1917 are highlighted.

Key words: Belarus, Western front, agriculture, requisition, food problem, food committee, panary monopoly, fixed price.

**Уводзіны.** За апошняе дзесяцігоддзе колькасць публікацый, прысвечаных Беларусі часоў Першай сусветнай вайны, прыкметна павялічылася. Асноўная прычына гэтага нам бачыцца ў асэнсаванні сучаснымі даследчыкамі важнасці менавіта гэтага перыяду, у якім, акрамя іншага, выспявала беларуская дзяржаўнасць. А ці магла яна існаваць на ўласным эканамічным грунце – аб тым варта пагаварыць асобна, узяўшы да разгляду важнейшае на той час харчовае пытанне. Існуючая на гэты конт літаратура, напісаная ў рэчышчы камуністычнай парадыгмы, называе яго невырашанасць адной з прычын рэвалюцыі, прычым як Лютаўскай, так і Кастрычніцкай. Наколькі справядлівыя такія палажэнні, можна пераканацца на прыкладзе разгляду становішча, якое склалася ў справе забеспячэння прадуктамі акопнікаў і жыхароў прыфрантавой Беларусі напрыканцы існавання царызму і ў пачатку Лютаўскай рэвалюцыі.

**Асноўная частка.** У планах расійскіх чыноўнікаў беларускія губерні ў харчовым апекце адносіліся да спажывецкіх, а не вытворчых. Па паведамленні земскай газеты, Магілёўшчына была жывёлагадоўчай і ніколі не была вытворцай хлеба [1]. Паводле слоў князя У. Друцкага-Сакальнінскага, падначаленая яму губерня ў тры разы больш спажывала прадуктаў, чым стварала іх [2]. Віцебская губерня таксама не вызначалася высокай прадукцыйнасцю сваіх гаспадарак. Але аграрнае насельніцтва Беларусі прыцягвалася да абавязковых паставак ялавічыны, свініны, жыта, аўса, ячменю, бульбы і іншых прадуктаў, якіх і ў мірны час не заўсёды хапала для таго, каб насыціць мясцовы рынак.

Асноўныя функцыі па забеспячэнні акопнікаў хлебам, гароднінай, мясам і іншым былі ўскладзены на інтэнданцкія службы Заходняга (Снабзах) і Паўночнага (Снабпаўн) франтоў, Дзвінскай і Мінскай ваенных акруг, камітэта Усерасійскага земскага саюза пры ІІ арміі. Ім дапамагалі ўпаўнаважаныя асобы міністэрства земляробства па закупках хлеба для арміі і ўпаўнаважаныя Старшыні Асобай нарады па харчовай справе. Упаўнаважанымі азначаных устаноў з'яўляліся мясцовыя губернатары або старшыні губернскіх управ.

Акрамя закупачных і рэквізіцыйных нарыхтовак, на адрас франтавікоў паступалі ахвяраванні прадуктаў ад сялян і памешчыкаў. У цэлым, армія не адчувала недахопу ў харчаванні.

Што датычыць гарадскіх і местачковых жыхароў і бежанцаў, то іх харчовым забеспячэннем былі заняты адмысловыя харчовыя камісіі, складзеныя на базе органаў мясцовага самакіравання. Пераважна сельскагаспадарчы характар эканомікі Беларусі дазваляў вясковым жыхарам пераносіць ваеннае ліхалецце, тым не менш і яны маглі разлічваць на цэнтралізаванае забеспячэнне цукрам, чаем, пшанічнай мукой і іншымі прадуктамі, прывезенымі з паўднёвых губерняў імперыі.

Больш ці менш нармальнаму харчоваму становішчу ў Беларусі спрыяла адладжаная сістэма ўліку колькасці двароў у гарадах і колькасці гаспадарак у сельскай мясцовасці, наяўнасці пасяўных плошчаў, засеяных культур, іх прагназаванай ураджайнасці, сабранага ўраджаю і яго размеркавання.

Паводле сельскагаспадарчых перапісаў, ва ўсіх гаспадарках, незалежна ад іх прыналежнасці, было ўлічана пагалоўе коней, кароў, свіней і авечак. Адпаведна былі ўведзены нормы спажывання на аднаго едака і на ўтрыманне кожнай жывёліны. Сельскія гаспадары або гарадскія гандляры, якія валодалі прадуктамі, былі абавязаны паведаміць аб сваіх запасах харчовым камісіям. Тыя ж, хто ўхіляўся ад падачы звестак, рызыкаваў заплаціць штраф 3 тыс. руб. альбо трапіць у турму на 3 месяцы [3].

Нарміраванне ўладамі спажывання прадуктаў і таксацыя іх коштаў пэўным чынам спрыяла ашчаднаму выкарыстанню мясцовых рэсурсаў у агульных мэтах. Сяляне мелі магчымасць з выгодай для сябе прадаць лішкі сваёй прадукцыі. Так, па словах камандзіра харчовага транспарта грэнадзёрскага корпуса, жыхары вёсак Вялікая і Малая Ужанка, Круты Бераг і Вялікая Ліпа Гарадзейскай воласці прадалі яму «шмат рознага харчу па жахліва высокаму кошту» [4, а. 9].

Прадуктовы дэфіцыт таксама не выключаў ўмоў для дзейнасці спекулянтаў, бо законы свабоднага рынку выяўляліся мацней, чым законы ваеннага часу. У прыватнасці, нягледзячы на пагрозу санкцый, уладальнікі прадуктаў не спяшаліся збываць іх у спадзяванні зрабіць гэта вясной, і не па фіксаваных («цвёрдых»), а па рынкавых коштах. У выніку асноўнай масе насельніцтва даводзілася чакаць, каб атаварыць свае прадуктовыя карткі. «Мы бачым мноства “хвастоў”, – пісала 27 лютага 1917 г. газета «Минский голос» пра чэргі на гарадскіх вуліцах, – у якіх гадзінамі стаіць бедны клас для атрымання розных прадуктаў».

Ва ўмовах пагаршэння транспартных перавозак прадуктаў з вытворчых губерняў у спажывецкія вышэйшае чынавенства прыйшло да высновы аб неабходнасці ўпарадкавання харчовай справы, бо існаваўшая сістэма нарыхтовак і продажу прадуктаў з-за іх дэфіцыту і дарагоўлі не выключала магчымасці ўзнікнення голаду і сацыяльнай напружанасці. З гэтай нагоды ў Мінскай губерні загадам міністра земляробства А. Рытціха ад 29 лістапада 1916 г. было развёрстана (размеркавана па ўсіх гаспадарках для здачы) 450 000 пудоў жыта, у «запас для мясцовага насельніцтва на выпадак вострай патрэбы яго ў харчаванні». З сабраных у студзені 1917 г. 391 765 пудоў жыта на патрэбы фронту перадавалася 59 903 пуды, 247 874 пуды былі прададзены гарадскім управам і іншым установам, а астатняе жыта пакідалася ў запас [5, а. 2].

Такі расход збожжа, акрамя іншага, сведчыў аб добрай забяспечанасці ім вайскоўцаў. Рэквізіцыі буйнарагатай жывёлы, якія прайшлі ў 1916 г. у Магілёўскай і Мінскай губернях, далі фронту дастаткова мяса. У дадатак да ўсяго на пачатку 1917 г. па Беларусі адбыліся дабрачынныя зборы прадуктаў і іншых рэчаў на карысць акопнікаў, таму ўзнікшыя ў тыле харчовыя цяжкасці іх не закранулі.

З снежня 1916 г. загадам А. Рытціха ўводзілася так званая «харчовая павіннасць», сутнасць якой заключалася ў тым, што кожны хлебароб або ўладальнік сельгаспрадукцыі быў абавязаны прадаць яе пэўную частку харчовай камісіі. Так, у Мінску 12 снежня на нарадзе з удзелам старшынь губернскай і павятовых земскіх упраў абылася развёрстка аўса па паветах. На 24 снежня 1916 г. прызначаліся валасныя сходы, каб размеркаваць пастаўкі аўса паміж сельскімі грамадствамі кожнай воласці. Да гэтага часу па заданні Упаўнаважанага па закупцы хлеба для арміі ў Віцебскай губерні па 17 валасцях Дрысенскага павета ўжо было развёрстана 27 035 пудоў аўса [6, а. 15].

У снежні 1916 г. мясцовыя органы ўлады атрымалі чарговы загад аб стварэнні запасаў жытнёвай мукі. Кожны павет Беларусі мусіў ссыпаць у грамадскія магазіны па 60–80 тыс. пудоў жыта.

Агульнарасійская нарада па харчовай справе прыняла пастанову аб увозе ў Мінскую губерню 500 000 пудоў аўса і да 100 000 пудоў ячменю, што, на думку губернатара У. Друцкага-Сакальнінскага, «у сукупнасці з пэўнымі запасамі, якія маюцца ў насельніцтва, задаволяць існуючыя патрэбы» [7, а. 8].

Усталяваная хлебная павіннасць распаўсюджвался не толькі на арандатараў, іспольшчыкаў, сялян і іншых уладальнікаў хлебных запасаў», але і на памешчыкаў. Так, 18 студзеня 1917 г. начальнік службы па нарыхтоўцы фуражу (Цэнтрафураж) князь Туманаў адаў загад губернатарам рэквізаваць у буйных землеўладальнікаў запасы аўса і здаць у бліжэйшыя

магазіны [8, а. 33]. Можна сцвярджаць, што ўлады аб'ектыўна ацэньвалі важнасць харчовай праблемы і прадпрымалі адэкватныя захады па яе вырашэнні.

Як і чакалася, да канца зімы 1917 г. харчовая праблема ў гарадах Беларусі абвастрылася, бо колькасць тэлеграм з паветаў і валасцей на адрас губернатараў з просьбай аб пастаўках прадуктаў рэзка павялічылася. У самім Мінску сітуацыя была не лепшай, бо па прычыне поў-нага перапынення даставак жыта з ураджайных паветаў губерні, а таксама з-за скарачэння яе падвозу з паўднёвых рэгіёнаў краіны мука пе-раўзышла цвёрды кошт удвая і нават утрая. Але ні ваенныя, ні цывільныя ўлады не рабілі спроб узяць пад кантроль гандлёвыя здзелкі, звязаныя з харчовымі прадуктамі, фуражом, і гэтым з выгодай для сябе карысталіся іх гандляры.

Наогул, насельніцтва Беларусі, галоўным чынам гарадское, адчувала часовы недахоп прадуктаў, звязаны з іх дэфіцытам, дарагоўляй, парушэннем графіка цэнтралізаванага падвозу, карыслівай дзейнасцю гандляроў і іншымі прычынамі. На выпадак крызіснага пагаршэння харчовага становішча маглі быць выкарыстаны значныя запасы збожжа, размешчанага ў грамадскіх магазінах. Але па практыцы папярэдніх гадоў гэта былі часовыя цяжкасці, уласцівыя ваенным абставінам, і асаблівага непакою ў жыхароў і ўлад не выклікалі.

У той самы час у Петраградзе абвастрэнне харчовай праблемы залічылася да палітычнага крызісу. Дакладней сказаць, гіпербалізаваныя чуткі аб ёй былі выкарыстаны экстрэмісцкімі элементамі ва антыўрадавых мэтах. Але гарадскія ўлады не адчувалі небяспекі і імкнуліся пераканаць удзельнікаў хваляванняў у тым, быццам «Петраград забяспечаны хлебам. Апасенні пра недахоп хлеба беспадстаўныя» [9]. Як высветлілася пазней, чуткі пра пагрозу голаду былі значна перабольшаны, але лідары Дзяржаўнай думы, атрымаўшы вярхоўную ўладу, скарысталі іх для таго, каб прадухіліць распаўзанне рэвалюцыйнай стыхіі па ўсёй краіне. З гэтай нагоды яны сканцэнтравалі ўвагу грамадскасці на небяспецы масавага голаду.

3 сакавіка 1917 г. старшыня Дзяржаўнай думы і Выканкам Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў заклікалі грамадзян Расіі, земляробаў, гандляроў, чыгуначнікаў дапамагчы радзіме і прадаць хлеб нарыхтоўчым службам. Можна меркаваць, што падпісанты баяліся паўтору сталічнага сцэнарыю, калі недахоп прадуктаў мог быць выкарыстаны на месцах як падстава для гвалту супраць рудыментаў самаўладдзя.

Таго ж 3 сакавіка Часовы камітэт Дзяржаўнай думы па ўзгадненні з Петраградскім Саветам у мэтах паляпшэння харчовага становішча ў дзяржаве санкцыянаваў рэквізіцыю хлеба ў буйных зямельных уласнікаў і арэндатараў, якія мелі не менш за 50 дзесяцін ворыва, а таксама ў гандлёвых устаноў і банкаў. Гэтая праца даручалася губернскім земствам праз створаныя імі харчовыя камітэты, якім надаваліся паўнамоцтвы па агульным кіраўніцтве харчовай справай губерні, выкананнем нарадаў цэнтральнай улады для патрэб арміі і насельніцтва, а таксама па арганізацыі павятовых і валасных харчовых камітэтаў [10].

У функцыі апошніх уключаліся: улік наяўнасці збожжа і едакоў, вызначэнне лішку і нястачы прадуктаў, харчовае задавальненне насельніцтва. У кожнай воласці ўправа мусіла ўзяць на ўлік хлеб у памешчыкаў, сялян, гандляроў і млынароў. Яна ж загадвала пунктам ссыпкі, адпраўкі хлеба і выдачай спажывецкіх картак [11, а. 21].

10 сакавіка па Расіі разышлася цыркулярная тэлеграма Дзяржаўнай думы за подпісам яе старшыні У. Радзянкі да «грамадзян Расіі, жыхароў вёскі» з заклікам неадкладна дапамагчы забеспячэнню арміі і насельніцтва збожжам, мукой, крупамі і іншымі прадуктамі. 14 сакавіка ў чарговай тэлеграме У. Радзянкі да «грамадзян памешчыкаў, землеўладальнікаў, сялян, казакоў, арандатараў і ўсіх, хто працуе на зямлі» прагучаў заклік не пакідаць незасеянымі пашы і звяртацца за дапамогай у харчовыя камітэты [12, а. 19–21].

Між тым у Беларусі разам з усталяваннем новага ладу вырашаліся мясцовыя, у тым ліку харчовыя праблемы. Найскладанейшая такога кшталту сітуацыя існавала ў асобных паветах Віцебшчыны. Так, 12 сакавіка ў адказ на паведамленне аб распачатым «народным хваляванні» ў Рэжыцы і павеце з-за недахопу хлеба губернскі камісар Карташоў М. накіраваў у распараджэнне павятовага камісара вагон жытнёвай мукі. У той самы дзень такі ж груз быў накіраваны ў Себеж [13, а. 66]. Акрамя мясцовых запасаў, выкрыстоўваліся прывезеныя прадукты. Неўзабаве губерня атрымала 148 000 пудоў харчовых грузаў [14, а. 327].

У цэлым, у сакавіку 1917 г. сітуацыя з харчаваннем ва ўсёй краіне, у тым ліку і ў Беларусі, значна палепшылася, Так, кошт прадметаў першай неабходнасці ў Мінску і Гомелі рэзка панізіўся. Як пісала газета «Рускае слова» ад 11 сакавіка, у Мазыры «кошт на хлеб і муку ўпаў адразу, што сведчыць аб ранейшай дзейнасці мясцовай паліцыі, якая спрыяла спекулянтам».

Не апошнюю ролю ў зніжэнні харчовай напружанасці ў гарадах адыграла масавая агітацыйна-прапагандысцкая кампанія з нагоды ўсталявання новага ладу з удзелам усіх пластоў

насельніцтва, у тым ліку сялян і буйных землеўладальнікаў, якія абавязаліся пастаўляць і ахвяраваць сельгаспрадукты на карысць арміі і ўсяго грамадства.

25 сакавіка урад зацвердзіў законапраект аб увядзенні дзяржаўнай манаполіі на гандаль хлебам [15]. Усе яго ўладальнікі хлеба, у тым ліку і спажыўцы, былі абавязаны па першым патрабаванні харчовага камітэта аб'явіць аб колькасці запасаў хлеба, едакоў, жывёлы, зямлі. Яны ж абвязаліся даставіць хлеб на франкастанцыі ці прыстані і здаць яго харчовым арганізацыям па вызначаных імі цвёрдых коштах.

На працягу сакавіка – красавіка адбылося ўтварэнне губернскіх харчовых камітэтаў у Віцебску (старшыня М. Кандрацьеў), Магілёве (І. Мусерскі), Дзісне (І. Каспяровіч). Б. Самойленка спалучаў пасаду старшыні Мінскага губернскага харчовага камітэта з пасадамі старшыні губернскага земства і губернскага камісарыята. Адпаведна харчовыя камітэты пачалі фарміравацца ў павятовых і валасных цэнтрах. У сваёй масе яны складаліся з прадстаўнікоў усіх пластоў насельніцтва, але з перавагай сялян. Лепш, чым у іншых гарадах, дзейнасць харчовых камітэтаў была наладжана ў Мінску. Тут 30 красавіка на пасяджэнні губернскага харчовага камітэта былі прыняты нормы харчавання на аднаго едака і аднаго каня, а таксама вызначаны адлік паступлення новага ўраджаю з тым, каб пачаць яго продаж па новых коштах. Акрамя таго, па прычыне малых запасаў хлеба ў губерні, было пастаноўлена ў мэтах яго ўліку здзейсніць суцэльнае абследаванне прыватнаўласніцкіх і сялянскіх гаспадарак.

Знішчэнне ранейшых органаў улады і замена іх новымі структурамі, абіраемымі грамадствам, рэарганізацыя органаў правапарадку і гарадскіх і земскіх самакіраванняў, дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця – усё гэта і іншае не магло не паўплываць на стан выканання насельніцтвам сваіх павіннасцей, у тым ліку харчовай у маштабе ўсёй Расіі. Так, галоўнакамандуючы Заходнім фронтам паскардзіўся Часоваму ўраду на недапастаўкі сена за сакавік – красавік. Нават у маі на фронт штодня паступала 3000 пудоў сена замест 23 000 [13, а. 353].

Як адзначала Бюро па скліканні Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў, з Вялікадня ў краіне перапыніўся падвоз хлеба і фуражу ў армію і ў горад. Нягледзячы на велізарныя запасы гэтых прадуктаў, сяляне не спяшаліся вывозіць іх на станцыі і прыстані. 1 мая міністр земляробства Шынгароў А. на з'ездзе сялянскіх дэлегатаў Магілёўскай губерні папярэдзіў, што на франтах фуражу і хлеба засталося на адзін дзень, і заклікаў сялян да выканання свайго грамадзянскага абавязку [16].

Са свайго боку Франтавы з'езд Усерасійскага земскага саюза вырашыў стварыць кадры агітатараў для аб'езду вёсак з заклікам здаваць хлеб арміі [17]. Са свайго боку Гомельскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў накіраваў па павеце сваіх дэлегатаў для неадкладнага збору фуражу і хлеба, а таксама звярнуўся да сялян з заклікам знайсці хлеб у памешчыкаў [18].

З беларускіх губерняў найбольш «хлебнай» заставалася Магілёўская. Тут размяшчалася 57 000 пудоў хлеба, ахвяраванага арміі яшчэ да рэвалюцыі [19]. Найгоршая сітуацыя с хлебам складвалася ў асобных паветах Віцебшчыны. 25 красавіка Дрысенскі начальнік гарнізона прасіў дапамогі ў Віцебскага губернскага камісара з прычыны адсутнасці мукі ў земстве і распачатага голаду сем'яў ваеннаабавязаных [20, а. 123]. Было відавочна, што харчовыя камітэты яшчэ слаба выконвалі свае нарыхтоўчыя функцыі. Характэрна, што ў некаторых валасцях Віцебскай губерні яны так і не былі створаны. У маі старшыні харчовага камітэта Кандрацьеву М. падчас паездкі ў Петраград удалося дабіцца павелічэння нарада для губерні ў 62 вагоны жыта і жытнёвай мукі яшчэ на 90, але ўпэўненасці ў іх атрымцы не было [13, а. 384]. Усяго ж харчовых нарадаў з цэнтра для Віцебскай губерні на май было запланавана 192 вагоны, для Віленскай – 47, Мінскай – 285 і Магілёўскай – 170 вагонаў [14, а. 320].

Гэта не азначала, што запланаваныя ўрадам грузы ў поўным аб'ёме і своечасова будуць дастаўлены на пункты прызначэння, але па меры выспявання новага ўраджаю спадзяванні на цэнтралізаваныя пастаўкі ўсё больш узрасталі. Асноўная прычына таму – слабыя вынікі дзяржаўных нарыхтовак хлеба на месцах, паколькі сялян не задавальнялі цвёрдыя кошты. У паўднёвых паветах Мінскай губерні сяляне хавалі хлеб і нават адмовіліся даць звесткі аб яго запасах [21].

Аналагічная сітуацыя стала назірацца і ў час рэквізіцый жывёлы. Па паведамленні газеты «Витебский листок» за 14 чэрвеня, Віцебскаму губернскаму харчоваму камітэту належала рэквізаваць 113 000 свіней і 67 000 галоў буйнарагатай жывёлы для патрэб насельніцтва і арміі. На долю Мінскай губерні па ўрадавай развёрстцы адводзілася 14 712 000 пудоў мяса і 2 279 000 пудоў сала з надбаўкай да цвёрдага кошту ў 1 руб. за пуд жывой вагі [22]. Але нягледзячы на надбаўку, рэквізіцыя адбывалася слаба па той прычыне, што сяляне хавалі жывёлу і не жадалі яе прадаваць [23]. Дэпутаты сялянскіх Саветаў Віленскай і Ковенскай губерняў наогул выказаліся супраць масавай рэквізіцыі жывёлы [24].

Наогул, харчовае пытанне ў Беларусі ўсё часцей перапляталася з аграрным і ўцягвала

ў сферу свайго ўплыву ўсё большае кола ўдзельнікаў – ад адзінкавых асоб да насельніцтва цэлых гарадоў. Не магла не выклікаць непакою і тыя абставіны, што да ліку тых, хто цярпеў харчовую нястачу, імкліва далучаліся салдаты Заходняга фронту.

**Заключэнне.** Такім чынам, пасля звяржэння самаўладдзя вастрыня харчовай праблемы ў Беларусі часова знізілася, паколькі для яе вырашэння былі скарыстаны прадуктовыя запасы, новыя паступленні ад мясцовых хлебаробаў і цэнтралізаваныя пастаўкі. Урэгуляванню становішча паспрыяла тая акалічнасць, што Заходні фронт не адчуваў істотнай харчовай нястачы, і таму асноўны аб'ём прадуктаў быў скіраваны для патрэб насельніцтва і цывільных устаноў. У гэтай сувязі заявы маладых даследчыкаў Хаданёнка В. і Паўлава Л. аб нібыта крытычным стане сельскай гаспадаркі Беларусі і такім жа крытычным становішчы з забеспячэннем фронту ў лютым 1917 г. зусім беспадстаўныя.

Іншая справа, што пасля ўсталявання новага ладу ў краіне харчовая праблема ў Беларусі не перастала існаваць, а, як і паўсюдна ў Расіі, набыла іншы змест. Калі да Лютаўскай рэвалюцыі яна асацыіравалася з «голадам», які ўзнік па прычыне нястачы прадуктаў, то з абвяшчэннем Часовым урадам хлебнай манаполіі новая яго пагроза вынікала з нежадання сялянства прадаваць прадукты сваёй працы па цвёрдых коштах. Новай з'явай ва ўзрастанні харчовай праблемы зрабілася тое, што яна ахапіла армію. Па-другое, у спосабах яе вырашэння акрэсліўся класавы (у інтарэсах працоўных) падыход; па-трэцяе, у працэсе яе вырашэння адбылося значнае паслабленне ўздзеяння органаў дзяржаўнай, у тым ліку ваеннай, улады; па-чацвёртае, у працэсе яе вырашэння выявілася буйная памылка Часовага ўрада, які не прыняў да ўвагі патрабаванні сялянства аб увядзенні цвёрдых коштаў не толькі на хлеб, а і на ўсе прамысловыя тавары. Харчовае становішча рабілася ўсё больш напружаным нават тады, калі ў сістэме Часовага ўрада было створана адмысловае міністэрства харчавання на чале з А. Пешахонавым. Відавочна, што ў Беларусі яшчэ задоўга да часу збору новага ўраджаю харчовая праблема стала набіраць прыкметы пастаяннай з тэндэнцыяй да абвастрэння. Відавочна, што найважнейшая прычына таго палягала не ў «катастрафічным стане» сельскай гаспадаркі, а ў няздольнасці грамадства рацыянальна скарыстаць яе багацці ў агульных інтарэсах.

## Літаратура

1. Могилёвская жизнь. 1917. 10 нояб.
2. Минский голос. 1917. 27 февр.
3. Минские губернские ведомости. 1916. 5 нояб.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 640. Воп. 1. Адз. зах. 19.
5. НАРБ. Ф. 640. Воп. 2. Адз. зах. 21.
6. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Адз. зах. 52.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1265. Воп. 1. Адз. зах. 3.
8. НАРБ. Ф. 640. Воп. 1. Адз. зах. 1.
9. Газета-копейка. 1917. 25 февр.
10. Минский голос. 1917. 4 мар.
11. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Адз. зах. 7.
12. НАРБ. Ф. 622. Воп. 1. Адз. зах. 4.
13. НАРБ. Ф. 622. Воп. 1. Адз. зах. 2.
14. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Адз. зах. 5.
15. Русское слово. 1917. 28 мар.
16. Гомельская копейка. 1917. 6 мая.
17. Русское слово. 1917. 6 мая.
18. Известия Гомельского Совета. 1917. 9 мая.
19. Минский голос. 1917. 4 мая.
20. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Адз. зах. 242.
21. Фронт. 1917. 6 июня.
22. Новое варшавское утро. 1917. 2 авг.
23. Крестьянская газета. 1917. 21 июня.
24. Крестьянская газета. 1917. 28 июня.

## References

1. *Mogilevskaya zhizn'* [Mogilyov life], 1917, November, 10.
2. *Minskiy golos* [Minsk voice], 1917, February, 27.
3. *Minskiye gubernskiye vedomosti* [Minsk Province Gazette], 1916, November, 5.
4. National Archives of Republic of Belarus (NARB). Fund 640. I. 1. F. 19.

5. NARB. Fund. 640. I. 2. F. 21.
6. NARB. Fund. 624. I. 1. F. 52.
7. National Historical Archives of Belarus (NHAB). Fund. 1265. I. 1. F. 3.
8. NARB. Fund. 640. I. 1. F. 1.
9. *Gazeta-kopeyka* [Gazeta-kopeck], 1917, February, 25.
10. *Minskiy golos* [Minsk voice], 1917, March, 4.
11. NARB. Fund. 624. I. 1. F. 7.
12. NARB. Fund. 622. I. 1. F. 4.
13. NARB. Fund. 622. I p. 1. F. 2.
14. NARB. Fund. 624. I. 1. F. 5.
15. *Russkoye slovo* [Russian word], 1917, March, 28.
16. *Gomel'skaya kopeyka* [Gomel' kopeck], 1917, May, 6.
17. *Russkoe slovo* [Russian word], 1917, May, 6.
18. *Izvestiya Gomel'skogo Soveta* [News of Gomel' Soviet], 1917, May, 9.
19. *Minskiy golos* [Minsk voice], 1917, May, 4.
20. NARB. Fund. 60. I. 3. F. 242.
21. *Front* [Front], 1917, June, 6.
22. *Novoye varshavskoye utro* [New Warsaw morning], 1917, August, 2.
23. *Krest'yanskaya gazeta* [Peasant newspaper], 1917, June, 21.
24. *Krest'yanskaya gazeta* [Peasant newspaper],1917, June, 28.

## Інфармацыя пра аўтара

**Сяменчык Мікалай Яфімавіч** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: polity@bk.ru

## Information about the author

**Siamenchyk Mikalai Yafimavich** – DSc (History), Professor, Head of the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: polity@bk.ru

*Паступіў 13.03.2019*